Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Грыцкевіцкая сярэдняя школа”

Зямля з блакітнымі вачыма
канспект гутаркі-размовы ў першай рознаўзроставай групе

Грышчанка Наталія Вікенцьеўна,
выхавальнік дашкольнай адукацыі
1 кваліфікацыйнай катэгорыі

аг. Грыцкевічы, 2022

Мэта: фарміраванне актыўна слоўніка дзіцяці на аснове ўяўленняў аб навакольным жыцці, развіваць уменне адказваць на пытанні, звароты дарослага, удзельнічаць у агульнай размове, фарміраванне умення разумець значэння абагульняючых слоў (Радзіма, краіна, горад), выхаванне любові да Радзімы, да сімвалаў Рэспублікі Беларусь,

Абсталяванне: запіс песні "Мой родны кут", малюнкі і ілюстрацыі па тэме "Мая Радзіма", карта Беларусі, карцінкі з сімваламі Беларусі (зубр, Васілёк, бусел), плакаты "Бнларусь – мая Радзіма».

Папярэдняя праца:

чытанне вершаў беларускіх паэтаў пра Беларусь, яе прыроду, сузіранне ілюстрацый кніг, атласа Рэспублікі Беларусь, карцін пра прыроду Беларусі, паштовак з сімваламі беларускага краю, герба і сцяга краіны, праслухоўванне музычных твораў беларускіх кампазітараў.

Ход мерапрыемства.

Дзяўчынкі і хлопчыкі, давайце станем у круг і павітаем адзін аднаго!

Прыдумана кімсьці
Проста і мудра
Пры сустрэчы вітацца:
- Добрай раніцы!
- Добрай раніцы!
Сонцу і птушкам
Добрай раніцы!
Усмешлівым асобам.
І кожны становіцца
Добрым, даверлівым…
Хай добрая раніца
Доўжыцца да вечара!

Выхавальнік:

-А цяпер усе ўсталі! І мы з вамі крыху пагуляем!

Гульня "Мая краіна"

Пагляджу на карту я: (выцягваюць наперад прамыя далоні, глядзяць)
Вось беларуская зямля.
Ёсць лугі тут і палі,
Рэкі, лясы і азёры! (Загінаюць пальцы, пачынаючы з вялікага)
Я люблю цябе, Беларусь! (Моцна сціскаюць далоні ў замак)
Ты ж Радзіма мая! (Прыкладваюць рукі да грудзей)

Гучыць урывак з песні "Мой родны кут"

Што азначае слова Радзіма? Што такое Радзіма?

(дзеці адказваюць на пытанні)

- Правільна, дзеткі, Радзіма-гэта родная зямля, дом, кветкі, мама...Радзіма аб'ядноўвае ўсіх людзей, якія жывуць у адной краіне, яны гавораць на адной мове, адзначаюць агульныя святы.

-У якой краіне мы жывем?

- Як называюць людзей, якія жывуць у Беларусі?

- Як называецца наш аграгарадок?

Выхавальнік:

- Хлопчыкі, дзяўчынкі, а давайце мы з вамі Раскажам якая наша Беларусь? Беларусь якая?

Прыгожая, вялікая, зялёная, магутная, добрая, незалежная, шчодрая, любімая, сінявокая, родная, квітнеючая.

- А беларусы якія?

Працавітыя, клапатлівыя, добразычлівыя, цярплівыя, разумныя.

Фізкультмінутка “Добры дзень"

Добры дзень, сонца залатое! (дзеці падымаюць рукі ўверх)

Добры дзень, неба блакітнае! (разводзяць рукі ў бакі)

Добры дзень, вольны ветрык! (ківаюць рукамі з боку ў бок)

Прывітанне, маленькі дубок! (прысядаюць)

Мы жывем у адным краі- (пляскаюць у ладкі)

Усіх Я Вас вітаю! (рукі на поясе, павароты налева і направа)

Лясы, рэкі і палі – гэта Радзіма мая! (разводзяць рукі ў бакі)

Выхавальнік:

- Якія вы разумнічкі! А цяпер давайце мы ўсе падыдзем да  карты Беларусі! Паглядзіце, якая яна вялікая! Якая вялікая наша Беларусь! У нашай краіне 6 абласцей. Самая галоўная вобласць-Мінская. А ёсць яшчэ Брэсцкая, Віцебская, Гродненская, Гомельская і Магілёўская. Дзеткі, а ў нашай краіны ёсць асаблівыя сімвалы, якіх няма ў іншых краінах! Або зусім мала! Давайце зараз прымацуем нашы сімвалы на карту! Я буду паказваць карцінку, а вы называйце, што гэта. (выхавальнік паказвае карцінку азёр і рэк, бусла, зубра, васілька  і па чарзе прымацоўвае сімвалы на карту Беларусі).

Дзеці: называюць сімвалы Беларусі.

- Якія вы малайцы! Назвалі ўсе сімвалы нашай Беларусі! Вось і падышла да канца наша размова, шмат новага і цікавага мы сёння даведаліся.

Дзеткі, аб якой краіне мы сёння з вамі гутарылі, як яна называецца? Як называецца наша сталіца?